# Фестываль невыпадковых людзей

**"Фундаментальнай задачай нашай дзяржавы з'яўляецца выхаванне беларусаў як творцаў культуры, фарміраванне грамадскай думкі ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай мастацкай культуры як духоўнай сферы чалавека, асновы развіцця яго асабістай і прафесійнай культуры. Умова станаўлення чалавека культуры — асэнсаванне традыцый і традыцыйнасці, уменне бачыць закладзены ў іх духоўны патэнцыял. "Берагіня" — увасабленне добрага пачатку, які аберагае і чалавека, і культуру". Такімі словамі вітаў удзельнікаў VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня" начальнік упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Віктар Якжык. Заключныя мерапрыемствы фестывалю прайшлі 24—27 чэрвеня ў яго нязменнай "сталіцы" — гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці.**


Выступаюць "Нежачкі" з гарадскога пасёлка Расоны.

На гэтыя чатыры спякотныя чэрвеньскія дні Акцябрскі стаў эпіцэнтрам фальклорнага руху ў нашай краіне. Сёлета фестываль "Берагіня" сабраў 800 удзельнікаў (для параўнання — дванаццаць гадоў таму, калі фэст праводзіўся ўпершыню, іх было 300). Можна парадавацца і наступнай статыстыцы: 73 танцавальныя пары выканаўцаў народных побытавых танцаў, 21 дзіцячы калектыў і 8 аўтэнтычных калектываў, 7 замежных калектываў з Расіі, Украіны, Малдовы, Польшчы і Латвіі, 2 брэндавыя ансамблі ў якасці шаноўных гасцей ("Харошкі" і "Троіца") — усё гэта таксама "Берагіня", якая і беражэ, і зберагае тое, што называецца спадчынай, а калі хочаце, і нацыянальнай душой, і радзімай.

Ужо ў першы фестывальны дзень адбылася знакавая падзея, аналагічнай якой у Беларусі пакуль не было. На ўрачыстым адкрыцці фестывалю з рук старшыні На-


Семежаўскія "цары".

цыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзіміра Шчаснага прадстаўнікі Цэнтра культуры і адпачынку вёскі Семежава Капыльскага раёна атрымалі сертыфікат, які пацвярджае, што ўнікальны калядны абрад "Цары" з гэтай вёскі занесены ў Сусветны спіс шэдэўраў нематэрыяльнай спадчыны і знаходзіцца пад аховай ЮНЕСКА. Калі на сцэну выйшлі два зухаватыя семежаўскія "цары", каб атрымаць дакумент, Уладзімір Шчасны не змог утрымацца, каб не пажартаваць: "Я думаю, з такімі байцамі гэты абрад будзе ў надзейных руках, нагах, галовах і сэрцах". А "байцы", у сваю чаргу, яшчэ доўга пазіравалі перад камерамі журналістаў, падкрэсліваючы значнасць моманту. Як паведаміла "Настаўніцкай газеце" дырэктар Семежаўскага цэнтра культуры і адпачынку Таццяна Шаура, абрад быў адноўлены ў 1997 годзе. З гэтага часу штогод на так званы Шчодры вечар "цары" ходзяць па Семежаве і наглядна папулярызуюць гэты мясцовы эксклюзіў сярод жыхароў вёскі. Дарэчы, абсыці іх усіх пакуль не паспелі. У вёсцы налічваецца 1200 жыхароў, і чарга ахвочых пабачыць і пачаставаць "цароў" (частаванне — неад'емны рытуал абраду) з кожным годам толькі расце.

Натуральна, прыезд "цароў" менавіта на "Берагіню" быў зусім невыпадковым. Вельмі многае з таго, чым займаюцца і што прапагандуюць удзельнікі фестывалю, таксама можна аднесці да эксклюзіўнай нематэрыяльнай спадчыны. Адно з ключавых слоў фестывалю — аўтэнтыка. Якраз ёй, памножанай на чалавечую апантанасць і любоў да свайго, карэннага, і былі прасякнуты ўсе фестывальныя дзеі: VI Рэспубліканскі конкурс танцавальных пар — выканаўцаў народных побытавых танцаў (1/4 фіналу, паўфінал і фінал), IV Рэспубліканскі турнір дзіцячых фальклорных калектываў (праграмы "Музычнае мастацтва", "Харэаграфічнае мастацтва", "Дэкаратыўна-побытавае мастацтва" і ўласна прэзентацыі асобных канцэртных праграм), канцэрты фальклорных калектываў-доўгажыхароў "Берагіні" ("Нежачкі" з гарадскога пасёлка Расоны, "Сунічкі" з вёскі Стаі Лепельскага раёна, "Берагіня" з вёскі Мётча Барысаўскага раёна, "Талака" з БДУ культуры і мастацтваў, "Рудабельскія зорачкі", "Некрашынка" і "Цярэшкавы шчодрыкі" з Акцябрскага раёна), выступленні аўтэнтычных гуртоў, народнае свята "Рудабельскае купалле", свята народнай творчасці "Палескі кірмаш". Пераважна гэтую ж аўтэнтыку, толькі, натуральна, сваю ўнікальную, падаравалі жыхарам Акцябрскага і ўдзельнікам фестывалю і замежныя госці: дзіцячы фальклорны калектыў Гайгалаўскай асноўнай школы Рэзекненскага краю "Purinens" і дзіцячы фальклорны калектыў Вілянскага дома культуры "Biteites" з Латвіі, народны ансамбль песні і танца сяла Абаклія Басарабяскага раёна "Лія" з Малдовы, фальклорны калектыў Музея Малой Айчыны ў падляшскіх Студзіводах "Жэмэрва" з Польшчы, ансамбль народнага танца Палаца піянераў і школьнікаў горада Курска "Вясёлы абцасік" з Расіі, народны фальклорны ансамбль горада Шостка "Любісток" і народны крымска-татарскі ансамбль танца Феадасійскага гарадскога Дома культуры "Кара Даг" з Украіны. Апошні зрабіў асаблівы фурор — гэта было не проста выступленне, а сапраўднае фольк-шоу.

Зрэшты, фестываль запомніўся не толькі сваімі яркімі дзеямі, але і ўласна людзьмі, пачынаючы з яго нязменнага мастацкага кіраўніка і натхняльніка метадыста аддзела інавацыйных тэхналогій у сацыякультурнай дзейнасці Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Міколы Козенкі і заканчваючы самымі маленькімі ўдзельнікамі дзіцячых фальклорных калектываў. Блукаючы па гарадскім скверы Акцябрскага (галоўнай фестывальнай пляцоўцы) і беручы кароткія інтэрв'ю ў таго ці іншага "берагіньца", я шторaз даведваўся пра нейкія, здавалася б, непрыкметныя рэчы, але якія разам складваліся ў адзін цэльны панарамны "партрэт" пад назвай "Берагіня". Не мае берагоў шчодрая чалавечая душа гэтага фестывалю.

Вось, скажам, кіраўнік узорнага фальклорнага калектыву Хмелеўскага сельскага Дома культуры Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці "Даранасіца" Таццяна Грыцук з гордасцю адзначае, што дзецям-удзельнікам гурта вельмі падабаецца спяваць менавіта на так званай палескай мове. Назвы песень з багатага рэпертуару "Даранасіцы" гавораць самі за сябе: "Запрагайтэ сывых коней", "Ой, мы просо сіялы", "Полька-дрыгавка" і інш. І нібы між іншым Таццяна Дзмітрыеўна прызнаецца, што ўсе трое яе сыноў спяваюць і танцуюць. Пытаюся ў адзінаццацікласніка Сашы Дырмана з "Даранасіцы", ці засмуціўся ён, што не патрапіў у паўфінал конкурсу танцавальных пар. Яго адказ шмат у чым паказальны: "З аднаго боку — так, з другога — не. Бо я ўсё-такі паказаў, як танцавалі нашы дзяды і прадзеды. Танцаваў жа я не для журы, а для самога сябе і сваёй напарніцы".

Мастацкі кіраўнік фальклорнага гурта Любанскага раённага цэнтра культуры Мінскай вобласці "Жэўжык" Сяргей Выскварка (ён жа кіраўнік і любанскіх "Верабейкаў") можа гадзінамі распавядаць пра сваю мясцовую аўтэнтыку, напрыклад, пра гуртавы шматфігурны танец "Каваля" — адзіны танец такога тыпу ва ўсёй Беларусі. Калі Сяргей Георгіевіч запісваў гэты танец ад Аўдоцці Сцяпанаўны Чэкан у 1998 годзе, апошняй было 102 гады. "Для выступлення ў конкурсных праграмах мы ўзялі самыя рэдкія танцы, такія як "Страданія", "Сербіянка з прыпеўкамі", полька "Каза", "Авангерка"... Я наогул імкнуся зацікаўліваць дзяцей толькі рарытэтам. Старэйшыя дзеці, якія танцуюць у "Верабейках", ведаюць больш за сорак унікальных танцаў, адных толькі карагодаў — каля дзесяці!" — не хавае радасці за сваіх выхаванцаў Сяргей Выскварка. Нечакана падчас нашай гутаркі ў майго суразмоўцы звініць мабільны тэлефон. Заўважаю, што ён вымае яго з нейкага незразумелага мне прыстасавання, відавочна, яшчэ з дзедавых часоў. Атрымліваю тлумачэнне: "Гэта называецца кісет. Справа ў тым, што ўсё сучаснае, што мы дабаўляем да танцавальнага касцюма, яго разбурае. Мы доўга думалі, як быць з тымі ж мабільнікамі. І літаральна сёлета, зімой, у вёсцы Ляхаўка знайшлі куфар тамтэйшай бабы Софы, дзе і ляжаў вось гэты кісет. Па ўзоры гэтай аўтэнтычнай рэчы потым пашылі такія вось торбачкі для ўсіх "жэўжыкаў" і "верабейкаў". У іх можна пакласці і мабільнік, і грошы, і нават фотаапарат — і пры гэтым не разбураецца цэласнасць касцюма".

Тым часам бачу гэтакую ўвішную пару маленькіх беларусікаў. Літаральна пасярод цэнтральнай плошчы Акцябрскага яны самі па сабе танцуюць. Балазе, народная музыка на "Берагіні" ліецца з усіх бакоў. Падыходжу, знаёмлюся: пяцікласнікі Яна Васкевіч і Ягор


Яна Васкевіч і Ягор Касцюкавец з фальклорнага гурта "Расінка" (Любаншчына).

Касцюкавец, удзельнікі фальклорнага гурта "Расічка" Сароцкага сельскага Дома культуры Любанскага раёна, фіналісты конкурсу танцавальных пар. У вачах прачытваецца адно: "Нам тут падабаецца! Мы вельмі рады, што сюды прыехалі". Прашу іх папазіраваць у прыгожым руху для фотаздымка, дзеля пацвярджэння таго, што "Берагіня" — фестываль невыпадковых людзей. Хіба не відаць?

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота аўтара.**

## Прагноз надвор'я

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць. Без ападкаў. Вецер паўночна-ўсходні 4—9 м/с. Тэмпература паветра +23 — +29°С.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца:

30 чэрвеня невялікая воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер паўночна-ўсходні, усходні 3—8 м/с. Тэмпература паветра ноччу +8 — +16°С, па Гомельскай вобласці да +17 — +19°С; днём +24 — +29°С, у паўднёвых раёнах да +31°С.

1 ліпеня пераменная воблачнасць. Ноччу ў паўднёва-заходніх раёнах, днём месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер пераменных напрамкаў 3—8 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу +10 — +17°С, у Гомельскай вобласці да +19°С, днём +22 — +29°С, у паўднёва-ўсходніх раёнах да +31°С.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь выказвае шчырае спачуванне кансультанту ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі **Сідарэнка Раісе Станіславаўне** у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю МАЦІ.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе з прычыны смерці былога дырэктара Бабруйскага вышэйшага прафесійнага вучылішча дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прафесара, доктара педагагічных навук, народнага настаўніка СССР **Ларына Аркадзя Ягоравіча** і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ